# Уводзіны

## 1. Перадумовы ўзнікнення аб'екта даследавання

У перыяд да 1990 г. спецыфікай Вярхоўнага Савета (ВС) Беларусі як органа заканадаўства і прадстаўніцтва інтарэсаў была адсутнасць у ім апазіцыйных сіл. Ва ўмовах савецкага грамадска-палітычнага жыцця з яго аднапартыйнасцю, выбары ў ВС Беларускай ССР на працягу 1938—1985 гг. праходзілі па дакладна вызначаных сцэнарыях. Перамогу на гэтых квазівыбарах нязменна атрымліваў «непарушны блок камуністаў і беспартыйных». Дэпутацкія мандаты фактычна размяркоўваліся ў партыйных камітэтах паводле загадзя вызначаных квот, прычым будучыя дэпутаты падбіраліся паводле полаўзроставай, сацыяльнай, прафесійнай і партыйнай прыналежнасці.

Імітацыя прадстаўніцтва інтарэсаў у ВС значыла дэкаратыўнасць яго статуса як вышэйшага заканадаўчага органа. ВС Беларускай ССР паслухмяна зацвярджаў законапраекты, падрыхтаваныя камуністычнай партыяй рэспублікі, засяроджваўся на абмеркаванні дробных эканамічных і гаспадарчых пытанняў. Па сведчанні народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, які выбіраўся дэпутатам ВС X і XI скліканняў, дыскусіі, уласцівыя класічнаму парламенту, у ВС БССР фактычна адсутнічалі[1]. Аляксандр Лукашэнка ў 1991 г. заклікаў парламент не быць «канторай», якой ён, на думку гэтага імпэтнага дэпутата, выглядаў у 1980-я гг.[2]

Магчымасць змяніць сітуацыю з'явілася ў 1990 г., калі былі прызначаны выбары ў ВС БССР XII склікання. Менавіта пасля электаральнай кампаніі на пачатку 1990 г. у ВС патрапілі дэпутаты, якія склалі касцяк дэпутацкай групы Беларускага Народнага Фронту (БНФ) — першай палітычнай апазіцыі ў беларускім парламенце.

Парламенцкая апазіцыя БНФ не здолела б выкрышталізавацца, калі б не існавала ўласна Фронту. Беларускі Народны Фронт — зусім не выпадковая і не спантанная з'ява, да яго развіцця спрычыніўся цэлы комплекс фактараў. Безумоўна, за асноўны фактар варта ўважаць «перабудову» — рэформы, дэкляраваныя Генеральным сакратаром ЦК КПСС Міхаілам Гарбачовым ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. З 1985 г. свабода слова, прыватная ініцыятыва, абнаўленне кіраўнічых кадраў паступова рабіліся нормай. На фоне іншых рэспублік еўрапейскай часткі СССР у Беларусі працэсы дэмакратызацыі ішлі больш марудна і супярэчліва. Сярод прычын гэтай запаволенасці можна назваць адносна нізкую палітычную актыўнасць насельніцтва, варты жалю

[1] Гл.: Быкаў В. Поўны збор твораў. У 14 т. Т. 8. Мемуарная проза. — Мінск: Саюз беларускіх пісьменнікаў; Масква: Время, 2009. — С. 331—332.
[2] Гл.: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ). — Ф. 968. — Воп. 1. — Спр. 2917. — Арк. 225.

стан нацыянальнай мовы і культуры[3]. Тым не менш, і Беларусь з яе іміджам «Вандэі», г. зн. самай кансерватыўнай рэспублікі Савецкага Саюза, непазбежна і незваротна мянялася ў палітычным плане. Гэтыя змены заслугоўваюць найбольш пільнага вывучэння.

## 2. Крыніцы даследавання

Крыніцазнаўчая база нашага даследавання складаецца з двух блокаў матэрыялаў: архіўных і апублікаваных. Як будзе паказана ніжэй, кожны з гэтых блокаў мае ўласную градацыю.

Адбіраючы крыніцы, аўтар грунтаваўся на двух прынцыпах. Папершае, выкарыстоўваліся толькі пісьмовыя крыніцы, а таксама фотадакументы і некаторыя выяўленчыя матэрыялы. З прычыны наяўнасці шматлікіх пісьмовых матэрыялаў і фотадакументаў у гэтым выданні не былі выкарыстаны вусныя крыніцы (найперш ідзецца аб занатаваных успамінах членаў дэпутацкай групы БНФ). Як вядома, некаторыя даследчыкі ўжо займаюцца актыўнай апрацоўкай успамінаў[4], аднак мы пайшлі іншым шляхам.

Па-другое, аўтар гэтай кнігі вывучаў толькі тыя дакументы і матэрыялы, што знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Скарыстана таксама інфармацыя, што маецца ў вольным доступе, — перш за ўсё, публікацыі ў перыядычным друку і інтэрнэце.

Па-за нашай увагай засталіся асабістыя архівы былых членаў парламенцкай апазіцыі БНФ. Зянон Пазьняк і Сяргей Навумчык спасылаюцца на прыклад свайго калегі-парламентарыя Леаніда Дзейкі, які запісваў многія пасяджэнні ВС на партатыўны магнітафон, рабіў нататкі, фатаграфаваў[5]. Доступ да падобных крыніц залежыць ад жадання іх уладальніка, патрабуе наяўнасці асабістых або дзелавых кантактаў. Напрыклад, Мікалай Смяховіч, вывучаючы станаўленне прэзідэнцтва ў Беларусі[6], карыстаўся асабістым архівам былога актывіста дэпутацкай апазіцыі БНФ Валянціна Голубева. Гэтае выкарыстанне асабістых крыніц, відаць, тлумачыцца тым, што і М. Смяховіч, і В. Голубеў працавалі ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Ацэньваючы неапублікаваныя крыніцы, нельга не заўважыць своеасаблівую навукова-архіўную анамалію. У Нацыянальным архіве

[3] Гл., напрыклад: Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001 году. Аналітычныя артыкулы. — Менск: Аналітычная група; Варшава: Цэнтр дэмакратыі ўва Ўсходняй Эўропе IDEE, 2001. — С. 9.

[4] Гл.: Эвакуацыя апазіцыі: апошні год дзейнасці Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання ў друку і ўспамінах дэпутатаў / Пад рэд. Я. Анішчанкі. — 2-е выд. — Мінск: Воля, 2010. — 324 с.

[5] Пазьняк З., Навумчык С. Дэпутаты Незалежнасьці. — Нью-Ёрк, Вільня, Варшава: Беларускія ведамасьці, Таварыства беларускай культуры ў Летуве, 2010. — С. 279.

[6] Смяховіч М. Рэспубліка Беларусь у 1990—1994 гадах: пытанне аб прэзідэнцкім праўленні // Беларускі гістарычны часопіс. — 2011. — № 9. — С. 3—10.

Рэспублікі Беларусь адсутнічае агульны фонд БНФ, хаця ёсць, напрыклад, фонды Грамадзянскай партыі і партыі «Славянскі Сабор “Белая Русь”». Усведамляючы значнасць Фронту, які расхістаў асновы камуністычнай сістэмы ў Беларусі, мы не можам не выказаць шкадавання з нагоды адсутнасці архіўнага фонду БНФ. Звесткі, што маюць вартасць як матэрыял для даследчыкаў, павінны быць адкрыты для шырокай навуковай грамадскасці, а гэта магчыма толькі пасля перадачы дакументаў на пастаяннае архіўнае захоўванне.

Навуковы і грамадзянскі абавязак былых членаў парламенцкай апазіцыі БНФ — перадаць на захоўванне калі не арыгіналы, то хаця б копіі матэрыялаў, датычных іхняй дзейнасці ў 1990—1995 гг. Гэтыя матэрыялы сталі б неацэнным багаццем для даследчыкаў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі. Прыклад адказных паводзін прадэманстраваў былы актывіст парламенцкай апазіцыі БНФ, вядомы палітычны і грамадскі дзеяч Алег Трусаў. У асабістым фондзе № 576 (НАРБ) А. Трусава захоўваюцца матэрыялы, звязаныя з парламенцкай дзейнасцю апазіцыі БНФ: праекты законаў і пастаноў, прапанаваныя БНФ, заявы дэпутацкай групы БНФ, матэрыялы перыядычнага друку аб дзейнасці парламенцкай апазіцыі БНФ.

Вывучаныя намі архіўныя дакументы паддаюцца наступнай класіфікацыі: 1) дакументы аб стварэнні БНФ; 2) матэрыялы выбараў у ВС Беларусі XII склікання; 3) стэнаграма і пратаколы пасяджэнняў сесій ВС Беларусі; 4) праекты нарматыўна-прававых актаў, заяў, зваротаў, падрыхтаваныя як парламенцкай апазіцыяй БНФ у цэлым, так і яе асобнымі дзеячамі; 5) дэпутацкія запыты; 6) пракурорскія прадстаўленні; 7) фотаілюстрацыі.

Асноўныя архіўныя матэрыялы мы чэрпалі з фонду № 968 (Вярхоўны Савет, 1938—1996) НАРБ. Шэраг матэрыялаў быў выкарыстаны з ужо згаданага фонду № 576 (персанальны фонд А. Трусава, дэпутата Вярхоўнага Савета Беларусі XII склікання).

Апублікаваныя матэрыялы, што сталі крыніцамі нашага даследавання, падраздзяляюцца наступным чынам: 1) бюлетэні пасяджэнняў сесій ВС Беларусі XII склікання; 2) нарматыўна-прававыя акты; 3) перыядычныя выданні. Апошні прадстаўлены як дзяржаўнымі («Народная газета», «Звязда», «Советская Белоруссия», «Знамя юности», «Рэспубліка» і інш.), так і недзяржаўнымі («Свабода», «Выбар» і інш.) сродкамі масавай інфармацыі.

У апошні час у друку і электронных СМІ з’яўляюцца ўспаміны некаторых членаў дэпутацкай групы БНФ[7]. Паколькі зацікаўленыя асобы

[7] Гл.: Пазьняк З., Навумчык С. Дэпутаты Незалежнасьці. — Нью-Ёрк, Вільня, Варшава: Беларускія ведамасьці, Таварыства беларускай культуры ў Летуве, 2010. — 2010. — 304 с.; Навумчык С. Сем гадоў Адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995). — Варшава: Беларускія ведамасьці, 2006. — 140 с.; Садоўскі П. Мой шыбалет. Аўтабіяграфічныя арабэскі. — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2008. — 426 с.; Навумчык С. Дзевяноста першы. Год Незалежнасьці вачыма ўдзельніка. — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2013. — 536 с.

запісалі свае ўспаміны праз шмат гадоў пасля падзей, гэтыя запісы не могуць трактавацца ў якасці «ісціны ў апошняй інстанцыі», і ў нашай працы выкарыстоўваюцца пераважна як дадатковы інфарматыўны матэрыял.

Ацэньваючы ступень увядзення ў навуковы абарот крыніц, звязаных з праблематыкай даследавання, можна ўпэўнена канстатаваць, што наспела неабходнасць выдаць зборнік дакументаў і матэрыялаў, прысвечаны фармаванню, ідэалогіі і дзейнасці парламенцкай апазіцыі БНФ у ВС Беларусі XII склікання. Мы спадзяёмся, што наша праца стане кропкай адліку для новых тэарэтычных і практычных доследаў.

## 3. Метадалогія даследавання

У гэтым выданні мы кіруемся перадусім храналагічным прынцыпам: дакументы, незалежна ад паходжання, падаюцца ў адпаведнасці з датай іх з’яўлення. Раздзел «Перадгісторыя» ў нечым выбіваецца з агульнага кантэксту, бо ахоплівае 1988—1989 гг., калі ВС XII склікання яшчэ не дзейнічаў. Але мы мяркуем, што гэты раздзел не будзе лішнім: для нас важна было паказаць генезіс уласна БНФ, руху, які ўтворыць першую ў Вярхоўным Савеце Беларусі палітычную апазіцыю. Пасля «Перадгісторыі» матэрыял згрупаваны па гадах непасрэднай дзейнасці парламенцкай апазіцыі БНФ (1990—1995). Кожны з гадоў дзейнасці ілюструецца пэўнай колькасцю дакументаў і выяўленчых матэрыялаў. Агаворымся, што ў гэтай кнізе практычна не адлюстравана такая важная палітычная падзея, як першыя выбары Прэзідэнта Беларусі ў 1994 г., якая, на нашу думку, заслугоўвае асвятлення ў асобным выданні.

Абапіраючыся на храналагічны прынцып, мы выкарыстоўвалі традыцыйны для крыніцазнаўства *спецыяльны* метад, які выражаўся ў мэтаскіраваным адборы толькі тых дакументаў, якія непасрэдна тычыліся парламенцкай апазіцыі БНФ у ВС. Адным з крытэрыяў адбору дакументаў былі прозвішчы дэпутатаў. Прывядзем просты прыклад. У пратаколах пасяджэнняў ВС Беларусі XII склікання, захаваных у архіўных справах, абавязкова фіксаваліся прозвішчы тых дэпутатаў, якія выступалі на сесіі. Іначай кажучы, калі ў спісе выступоўцаў няма прозвішчаў членаў дэпутацкай групы БНФ, то канкрэтную справу можна адкласці ўбок, бо яна не адпавядае тэме. Гэты метад выкарыстоўваўся і пры аналізе перыядычнага друку: на першым этапе шукаліся і адбіраліся артыкулы менавіта прадстаўнікоў парламенцкай апазіцыі.

Аднак мала толькі прэзентаваць дакумент — трэба, каб чытачы зразумелі абстаноўку, у якой ён з’явіўся. З гэтай прычыны ўсе дакументы, цытаваныя ў зборніку, суправаджаюцца больш ці менш падрабязнымі каментарыямі і заўвагамі. Для разумення кантэксту аднаго спецыяльнага метаду было недастаткова, таму пры падрыхтоўцы выдання выкарыстоўваўся т. зв. *франтальны* метад, які вымагаў уліку

і сістэматызацыі максімальнай колькасці інфармацыі. Так, намі былі прагледжаны ўсе справы фондаў № 968 і № 576 НАРБ, усе бюлетэні пасяджэнняў сесій ВС Беларусі XII склікання, пераважная большасць рэспубліканскіх і некаторыя мясцовыя перыядычныя выданні, іншыя матэрыялы.

Інфармацыя, сабраная з выкарыстаннем франтальнага метаду, адлюстравана ў каментарыях і заўвагах ў выглядзе фармалізаванага апісання. Мяркуецца, што каментарыі дазволяць чытачам не толькі атрымаць агульнае ўражанне пра парламенцкую апазіцыю БНФ у ВС XII склікання, але і паглыбіць веды пра палітычную гісторыю Беларусі канца 1980-х — першай паловы 1990-х гадоў. Пры гэтым звесткі пра развіццё падзей, як правіла, абмяжоўваюцца перыядам 1990—1995 гг., у асобных выпадках развіццё прасочваецца да 1996 г. Падаецца інфармацыя пра тэрмін дзеяння некаторых нарматыўна-прававых актаў, прынятых у першай палове 1990-х гадоў.

Апісваючы палітычных і дзяржаўных дзеячаў, мы імкнуліся не да стварэння біяграфічных нарысаў як такіх, а да фіксацыі найбольш цікавых звестак, звязаных з той ці іншай асобай. «Палітычныя партрэты» будуць па магчымасці дамалёўвацца ў наступных выданнях.

Варта коратка акрэсліць і археаграфічны аспект нашай працы. Дакументы ў гэтым зборніку прапануюцца чытачам на мовах арыгіналаў (беларускай або рускай), аднак іхнія назвы ці апісанне заўсёды падаюцца па-беларуску.

Цытаты падаюцца на мове арыгінала, як і назвы публікацый (манаграфій, газетных і часопісных артыкулаў, інш.).

Значная частка дакументаў прыводзіцца ў вытрымках. Шматкроп'е ў тэксце дакументаў паказвае на тое, што дакумент быў скарочаны.

Пры наяўнасці ў дакументах арфаграфічных і сінтаксічных памылак яны выпраўляліся, што далей спецыяльна не агаворваецца. Усе выпраўленні былі зроблены так, каб ні ў якім разе не сказіць змест крыніцы. У выпадку сумневаў у сэнсе рабілася зноска: «так у тэксце».

Паколькі ў канцы выдання прыводзіцца спіс абрэвіятур, яны, як правіла, не расшыфроўваюцца ў асноўным корпусе тэксту. У згаданым спісе абрэвіятуры прыводзяцца на мове арыгінала (калі трэба, то падаецца і беларускі эквівалент), а іхнія расшыфроўкі — на беларускай мове.

Дакументы маюць суцэльную нумарацыю у межах аднаго года. У некаторых дакументах адсутнічае дакладная дата іх з'яўлення. Дата, устаноўленая аўтарам гэтага выдання, падаецца ў квадратных скобках.

## 4. Гіпотэза даследавання

У рамках гэтага даследавання мы сыходзім з гіпотэзы, што дэпутацкая група БНФ у ВС Беларусі XII склікання паводле ўсіх рэлевантных крытэрыяў адпавядала статусу парламенцкай апазіцыі. Гэтыя крытэрыі наступныя: 1) колькасць; 2) статус; 3) ідэалогія; 4) формы дзейнасці. Яны збольшага паддаюцца верыфікацыі.

Пры разглядзе першага крытэрыя непазбежна паўстае пытанне: колькі ж прадстаўнікоў налічвала дэпутацкая група БНФ? У сакавіку 1991 г. кіраўнік парламенцкай апазіцыі БНФ Зянон Пазьняк заяўляў у інтэрв'ю, што ў яго групу ўваходзяць 37 дэпутатаў — г. зн. крыху больш за 10% ад агульнай колькасці членаў Вярхоўнага Савета[8]. Праз два з паловай гады, 11 верасня 1993 г., дэпутат ВС ХІІ склікання Аляксандр Лукашэнка казаў у Мінску на «Кангрэсе народа Беларусі», што «мы уже не боимся 22—25 националистов, которым в Верховном Совете удавалось захлестывать все здравые идеи»[9].

Выглядае, памер дэпутацкай групы БНФ вагаўся ў залежнасці ад палітычнай кан'юнктуры, асабістых адносін дэпутатаў і іншых чыннікаў. Пра нестабільнасць гэтай групы сведчыць, да прыкладу, тое, што заявы парламенцкай апазіцыі БНФ у розныя гады падпісвалі розныя людзі. Трэба ўлічваць, што некаторыя дэпутаты, датычныя да парламенцкай апазіцыі БНФ, на выбары 1990 г. ішлі ў ВС не пад лозунгамі Фронту. Аднак у гэтай кнізе названыя дэпутаты (Галіна Сямдзянава і інш.) падаюцца як члены дэпутацкай групы БНФ, незалежна ад часу іхняга далучэння да апазіцыі.

Каб высветліць, хто ўсё ж стаяў ля вытокаў апазіцыі БНФ, мэтазгодна звярнуцца да супольных успамінаў Зянона Пазьняка і актывіста дэпутацкай групы БНФ, яе шматгадовага каардынатара Сяргея Навумчыка. З. Пазьняк прыводзіць спіс з дваццаці сямі прозвішчаў, прадстаўляючы іх як «хрыбет» парламенцкай апазіцыі[10]. Сапраўды, можна пагадзіцца з тым, што пералічаныя С. Навумчыкам і З. Пазьняком дэпутаты з'яўляліся паплечнікамі апазіцыі БНФ у ВС, падзялялі яе платформу, бралі ўдзел у ініцыятывах апазіцыі да канца 1995 г. Гэта пацвярджаецца ў розных крыніцах, у тым ліку і ў архіўных матэрыялах.

Практычна ўсе дэпутаты, якія ўтваралі «ядро» апазіцыі, так ці іначай фігуруюць у гэтым выданні. У якасці члена парламенцкай апазіцыі БНФ прадстаўлены і дэпутат Яўген Новікаў, хаця ў 2010 г. Зянон Пазьняк сцвярджаў, што «пасьля 2-3-х сэсыяў Вярхоўнага Савета» Новікаў быў з яе выгнаны — быццам бы за публікацыю ў газеце паклёпніцкага матэрыялу пра БНФ[11].

Аўтару гэтай працы не ўдалося знайсці матэрыял, пра які гаварыў З. Пазьняк, ні ў дзяржаўнай, ні ў недзяржаўнай прэсе першай паловы 1990-х гг., у тым ліку і ў газеце «Права человека», рэдагаванай самім Я. Новікавым. Паколькі ў той час Я. Новікаў нярэдка выступаў з прамовамі нацыянальна-дэмакратычнага зместу і адносіў сябе да апазіцыі БНФ (што публічна не абвяргалася яго

[8] Гл.: Уліцёнак А. Іншадумцы. Мыслящие иначе. — Мінск: Беларусь, 1991. — С. 304.
[9] Гл. заўв. да Дакумента № 17-93.
[10] Гл.: Пазьняк З., Навумчык С. Дэпутаты Незалежнасьці. — Нью-Ёрк, Вільня, Варшава: Беларускія ведамасьці, Таварыства беларускай культуры ў Летуве. — 2010. — С. 13.
[11] Тамсама. С. 12.

калегамі па ВС), падпісваў яе заявы, аўтар лічыць, што гэты дэпутат быў членам парламенцкай апазіцыі як мінімум да 9-й сесіі, адбытай увесну 1992 г.[12]

Пераходзячы да пункта 2 («статус»), варта ўлічваць, што, безумоўна, не кожная дэпутацкая група вызначаецца як парламенцкая апазіцыя. Дэпутацкая група можа адыгрываць ролю праўладнага фармавання або набыць статус парламенцкай апазіцыі праз пэўны — нават працяглы — час. Калі ж разглядаць аб'ект нашага даследавання, то спачатку было абвешчана аб фармаванні ў ВС дэпутацкай *групы* БНФ[13], і толькі потым — аб стварэнні парламенцкай *апазіцыі* БНФ[14]. Аднак, беручы пад увагу кароткі (менш чым два тыдні) часавы прамежак ад заявы пра існаванне дэпутацкай групы БНФ да самаабвяшчэння апошняй парламенцкай апазіцыяй, выглядае апраўданым выкарыстанне тэрмінаў «дэпутацкая група БНФ» і «апазіцыя БНФ у Вярхоўным Савеце» як сінонімаў.

Парламенцкай апазіцыі БНФ процістаялі тыя дэпутаты ВС, якіх умоўна можна атэставаць як парламенцкую большасць, або кансерватараў. Дэпутат Аляксандр Лукашэнка ў 1990 г. акрэсліў іхняе процістаянне так: «Одна линия хочет жить, как набежит, и оставить всё по-старому, другая линия хочет перемен»[15].

Ідэйна-палітычны партрэт парламенцкай большасці характарызаваўся, па-першае, імкненнем да эклектычных поглядаў, спалучэння нават узаемавыключальных крокаў. Па-другое, большасць згаджалася толькі на палавінчатыя, касметычныя рэформы, якія апрыёры не закраналі інтарэсаў уладных структур, а да таго ж адтэрміноўвала прыняцце адпаведных рашэнняў, заканадаўчых актаў.

Істотная слабасць парламенцкай апазіцыі БНФ заключалася ў тым, што апазіцыянераў бракавала ў кіраўніцтве ВС. Так, няўдалай аказалася спроба актывіста дэпутацкай групы БНФ Уладзіміра Заблоцкага ўзначаліць ВС[16]. Яго паплечнікі не былі прадстаўлены ў кіраўніцтве пастаянных камісій ВС, між тым старшыня пастаяннай камісіі аўтаматычна станавіўся членам Прэзідыума ВС. Спробы прадстаўнікоў парламенцкай апазіцыі БНФ Галіны Сямдзянавай[17] і Мікалая Крыжаноўскага[18] ўзначаліць пастаянныя камісіі скончыліся няўдала. З членаў БНФ толькі Пятру Садоўскаму ўдалося стаць старшынёй пастаяннай камісіі ВС (па міжнародных справах і знешнеэканамічных

---

[12] Гл., напрыклад, Дакумент № 24-92. У 2014 г. Я. Новікаў з нейкіх прычын адмаўляў сваю колішнюю прыналежнасць да апазіцыі БНФ: «И ни в БНФ, ни в оппозиции БНФ в Верховном Совете 12 созыва я никогда не состоял!» (http://kyky.org/mag/heroes/ona-trupom-liazhiet-no-nie-postavit-kak-my-brali-intierviu-u-ievghieniia-novikova)

[13] Гл.: Дакумент № 19-90.

[14] Гл.: Дакумент № 23-90.

[15] Паўлаў У. Які ён, парламент па-беларуску? // Ударны фронт. — 1990. — 24 мая. — С. 1.

[16] Гл.: Дакумент № 24-91.

[17] Гл.: Дакумент № 11-90.

[18] Гл.: Дакумент № 12-90.

сувязях)[19], аднак з поўнай аддачай працаваў ён у ВС адносна нядоўга, бо ў 1992 г. быў прызначаны паслом Беларусі ў Германіі.

Што праўда, некаторыя члены дэпутацкай групы БНФ (Сяргей Слабчанка[20], Уладзімір Заблоцкі[21], Ігар Пырх[22]) узначальвалі часовыя камісіі ВС па тых ці іншых пытаннях, але кіраўніцтва такімі камісіямі не давала права на членства ў Прэзідыуме. Да таго ж парламенцкая большасць, як правіла, ігнаравала намаганні часовых камісій.

Варта дадаць, што ўлетку 1990 г. парламенцкая большасць заблакавала кандыдатуру Зянона Пазьняка на пасаду старшыні камісіі пры Вярхоўным Савеце па аказанні садзейнічання ў забеспячэнні правоў і інтарэсаў рэабілітаваных і па ўвекавечанні памяці ахвяр рэпрэсій[23]. Спроба кіраўніка парламенцкай апазіцыі заняць пасаду старшыні камісіі не была пазбаўлена логікі: З. Пазьняк меркаваў, што, распавёўшы свету пра месца масавых забойстваў у Курапатах (праз газету «Літаратура і мастацтва» ў 1988 г.), ён мае і юрыдычнае, і маральнае права кіраваць названай камісіяй. На той час яе статус быў значна ніжэйшы за статус пастаянных, дый нават часовых камісій ВС — так, яе старшыня не ўваходзіў у Прэзідыум ВС і не атрымліваў фіксаванай заработнай платы. Сама камісія не валодала кантрольнымі функцыямі і не мела права заканадаўчай ініцыятывы: фактычна вялося пра дарадчы орган без істотных паўнамоцтваў. Аднак пад канец 1980-х гг. пытанне рэабілітацыі незаконна асуджаных стала адной з папулярных у савецкім грамадстве тэм, і яго ўмелая падача дапамагала палітычным сілам павысіць пазнавальнасць, узняць уласны рэйтынг. Відавочна, у выпадку абрання З. Пазьняка парламенцкая апазіцыя паспрабавала б падвысіць прававы статус названай камісіі. Так ці інакш, БНФ меў шанс у 1990 г. пашырыць свой уплыў у ВС, але гэтага не адбылося.

Парламенцкая апазіцыя БНФ мела пэўную ідэалогію: пры ўсёй умоўнасці навуковых дэфініцый яе дапушчальна трактаваць як мадэрнізаваны нацыянал-дэмакратызм.

Першая асаблівасць ідэалогіі БНФ таго часу — бескампрамісны антыкамунізм, г. зн. варожасць да камуністычнай партыі, непрыманне СССР як нацыянальна-дзяржаўнага ўтварэння, адмова ад марксізму-ленінізму, нарэшце, жорсткая крытыка на адрас заснавальнікаў савецкага ладу, у прыватнасці, Уладзіміра Леніна і Іосіфа Сталіна.

Другая асаблівасць — арыентацыя на своеасаблівую мадэль беларускай дзяржаўнасці з акцэнтам на традыцыю, адпаведную атрыбутыку, мову. Адначасова ўсхваляліся рынкавыя адносіны, прыватная ўласнасць, наяўнасць нацыянальнай валюты, перадавыя тэхналогіі, палітычныя правы і свабоды. У той жа час беларусы фактычна

[19] Гл.: Дакумент № 13-90.
[20] Гл.: Дакумент № 16-90.
[21] Гл.: Дакумент № 17-90.
[22] Гл.: Дакумент № 21-91.
[23] Гл.: Дакументы №№ 14-90, 15-90.

ўзводзіліся ў ранг тытульнай нацыі, а прадстаўнікі іншых народаў у Беларусі мусілі задавальняцца статусам нацыянальных меншасцей.

У знешняй палітыцы беларуская дзяржава, паводле гэтай ідэалогіі, мусіла дыстанцыявацца ад буйных цэнтраў сілы, перш за ўсё ад Расіі і Захаду, і развіваць рэгіянальны (Балта-Чарнаморскі) напрамак. Дэкларавaліся нейтралітэт і бяз'ядзерны статус краіны, адсутнасць амбіцый сусветнага маштабу.

Галоўным ідэолагам БНФ, распрацоўнікам асноўных канцэпцый Фронту, бясспрэчна, з'яўляўся Зянон Пазьняк[24]. Ідэі і распрацоўкі іншых прадстаўнікоў парламенцкай апазіцыі мелі другасны характар і тычыліся больш канкрэтных спраў — напрыклад, зямельных пытанняў.

[24] Гл.: Богдан С. Нацыянальна-дэмакратычны праект беларускай палітыкі па версіі Зянона Пазьняка // Палітычная сфера. — 2010. — № 14. — С. 41—57; Богдан С. Незалежнасць і знешняя палітыка: візія беларускіх нацыянал-дэмакратаў, канец 1980-х — 1995 гг. (прыклад Зянона Пазьняка) // Палітычная сфера. — 2010. — № 14. — С. 102—123.